

Кухто Александр Тарасович, 1910 г.р., гвардии подполковник. Уроженец д. Трояны Бешенковичского района. Закончил Бешенковичскую НСШ, работал землеустроителем. В октябре 1934 г. призван в ряды Красной Армии. На фронтах Великой Отечественной войны с первого до последнего дня. Воевал на Южном, Северо-Кавказском, 3-ем Белорусском фронтах. Александр Тарасович прошел боевой путь от командира артиллерийской батареи, до начальника артиллерии корпуса. За годы Великой Отечественной войны получил 8 ранений и контузий. 31 июля 1947 г. демобилизован, вернулся в родной Бешенковичский район. С 1947 по 1949 гг. работал заместителем председателя и председателем Бешенковичского райисполкома, в 1950 – 1951 гг. был первым секретарем райкома КПБ и др. Избирался депутатом районного и областного Советов и Верховного Совета БССР. Работал в сельхозотделе Витебского обкома КПБ, возглавлял Лиозненский обком КПБ. Работал начальником кадров в аппарате Витебского облисполкома. Умер в 1982 г., похоронен в родной д. Трояны. Александр Тарасович Кухто награжден: орденом Красной Звезды, орденом Отечественной войны I степени, тремя орденами Красного Знамени, орденом Александра Невского, медалями: «За оборону Кавказа», «За боевые заслуги», «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.» и др.



Кухто Александр Тарасович. Фотография 1933 г.

# Наканавана было жыць

Яркі след у гісторыі раёна пакінуў Аляксандр Тарасавіч Кухто. 95-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца сёлета. Ды і ў памяці людзей гэта імя не згубілася, бо добрым, спагадлівым і чэсным быў чалавек…

Гамоняць вершалінамі дрэў траянскія могілкі, што знаходзяцца за вёскай, а ўнізе — цішыня і спакой. Тут знайшлі вечны прытулак многія прадстаўнікі працалюбівага і заслужанага роду Кухто — маці, Домна Усцінаўна, бацька, Тарас Анікеевіч, сястра Анастасія, адзіны сын Алег, жонка майго героя, Вера Аляксандраўна. Побач з імі пахаваны і сам Аляксандр Тарасавіч — гонар і слава прыдзвінскага краю.

…Неяк у самым пачатку вайны Анікеевічу прысніўся сон. Убачыў ён у садку яблыню з чатырма яблыкамі. Наляцеўшы нечакана адкуль вецер сарваў два з іх. На бальшыя яны пакаціліся. Свой сон сказаў жонцы, суседзям, каб тыя дапамаглі знайсці разгадку. Аднак таямнічы і загадкавы сон разгадаў сам і сказаў услых: "Не ўсе, відаць, сыны мае з фронта вернуцца".



Ход далейшых падзей пацвердзіў гэта. Зімой 1941 года, стрымліваючы ўпартае наступленне ворага на Маскву, склаў сваю галаву Павел Тарасавіч. У 1943 годзе настала чарга капітана-кавалерыста Якава Тарасавіча, які загінуў у Арлоўскай вобласці. Ні першая, ні другая пахаванка ў Траяны не дайшла. Была і трэцяя. На Аляксандра Тарасавіча. Аднак і яна не трапіла па прызначэнню. Аляксандр Тарасавіч яе сам убачыў, калі па ваенных справах знаходзіўся ў Маскве. Незвычайная паперка спачатку вельмі ўразіла, але потым нават рассмяшыла. Аказваецца, быў выпадак у яго баявой біяграфіі. У адным з баёў машыну, на якой ехаў палкоўнік Кухто, абстралялі варожай артылерыяй. Адзін снарад трапіў у яе. Моцным узрывам яго плашч з дакументамі адкінула ў адзін бок, а самога — у другі, і нават зямлёй зверху прысыпала. Аднапалчане адшукалі і плашч, і дакументы, і Аляксандра Тарасавіча, свайго камандзіра, які ад цяжкай кантузіі знаходзіўся ў глыбокай коме. Гэта і прадвызначыла з'яўленне той пахаванкі…

Ні раней, ні пазней не хацеў лёс песціць чалавека. Не паспяваў адысці ад адной кантузіі, як тут жа атрымліваў другую. Толькі загоіцца адно раненне, як варожая куля ці асколак снарада яго тут жа знаходзілі зноў. Словам, за час вайны Аляксандр Тарасавіч атрымаў каля 10 раненняў і кантузій. Здавалася, на яго целе не было здаровага месца. Асабліва дасталося правай руцэ, куды неаднойчы траплялі кулі. На аперацыю пагадзіўся толькі пасля дэмабілізацыі, калі разам з жонкай і сынам вярнуўся ў родныя Траяны.

Гэты прыезд на радзіму быў не першы за вайну. У 1944 годзе ён удзельнічаў у вызваленні Беларусі. Знаходзячыся непадалёк ад Віцебска, угаварыў камандаванне адпусціць наведаць родных. Кухто прыехаў у Бешанковічы на другі дзень пасля іх вызвалення. Колькі было радасці ад таго, што і бацькава хата ў Траянах засталася непашкоджанай. Але дарагое яго сэрцу роднае гняздо сустрэла сваё птушаня цішынёй двара і зачыненымі вокнамі. Стукацца ў дзверы не адважыўся, бо была ўпэўненасць, што яго родных, як і многія сем'і сыноў-камуністаў, расстралялі немцы. Сціснулася сэрца франтавіка. Але адкуль ні вазьміся суседка — Ефрасіння Малахаўна Гнеўка, узрадаваная ўсклікнула: "Тарасавіч! Твае ўсе жывыя!". Яна сама адчыніла дзверы ў хату. Тут былі маці і сястра. Бацька, на жаль, сына не дачакаўся — памёр за некалькі дзён да вызвалення.

Аляксандр Тарасавіч не сказаў родным, што няма ўжо ў жывых Якава і Паўла, пашкадаваў тым самым іх, а горкую вестку зацісну́ў глыбока ў душы. Але маці падмануць цяжка. Яна сама здагадалася пра нешта страшэннае, калі пачула як Аляксандр, наведаўшы сям'ю Якава, што жыла непадалёк, узяўшы на рукі яго дачку, шчыра спытаў тую: "Валюша! Ты будзеш маёй дачкой?" У той раз ён наведаўся і ў Ранчыцы, дзе жыла сястра Пелагея. Праз некалькі дзён, пакланіўшыся магіле бацькі, вярнуўся ў сваё падраздзяленне.

Пасля вяртання з Масквы, дзе яму ўдала была зроблена аперацыя, Кухто знаходзіўся на партыйнай і савецкай рабоце. У 1948 годзе ён быў прызначаны першым сакратаром Бешанковіцкага райкама КПБ і знаходзіўся на гэтай пасадзе да 1951 года, шмат зрабіўшы для аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Выбіраўся дэпутатам раённага, абласнога і Вярхоўнага Савета БССР, працаваў у сельгасаддзеле Віцебскага абкама КПБ, узначальваў Лёзненскі райкам партыі. Апошнія гады, ужо знаходзячыся на пенсіі, працаваў у апараце аблвыканкама — начальнікам аддзела кадраў.

А тым часам хвароба брала сваё, усё часцей трывожылі старыя раны, кантузіі. Трагічная развязка наступіла ў канцы снежня 1982 года. Труна з целам памёршага, падпарадкоўваючыся яго волі, была дастаўлена на радзіму…

Перад вамі, паважаныя чытачы, фотаздымак 1948 года, дзе вы бачыце Аляксандра Тарасавіча пры ўсіх рэгаліях — ордэнах Айчыннай вайны 1 ступені, Чырвонай Зоркі, Багдана Хмяльніцкага, Чырвонага Сцяга, якім ён узнагароджваўся тройчы, медалём "За баявыя заслугі". Гэта за мужнасць і гераізм праяўленыя на фронце. А лепшай нашай грамадзянскай узнагародай гэтаму чалавеку будзе памяць — вечная і трывалая.

**На здымку:** А. Т. Кухто.

…"Зары" падрыхтаваў Анатоль КРАЧКОЎСКІ.

Статья о Кухто Александре Тарасовиче в газете «Заря»











**Воинская часть:** 437 кап ЮжнФ
**Наименование награды:** Орден Красной Звезды
**Приказ подразделения №:** 1/н **от:** 04.11.1941

**Воинская часть:** 11 гв. ск 56 А СКФ, ОПА
**Наименование награды:** Орден Отечественной войны I степени
**Приказ подразделения №:** 129/н **от:** 27.10.1943

**Воинская часть:** 98 гв. ап 9 А СКФ
**Наименование награды:** Орден Красного Знамени
**Приказ подразделения №:** 130/н **от:** 17.06.1943

**Воинская часть:** штаб 11 гв. ск ПА
**Наименование награды:** Орден Красного Знамени
**Приказ подразделения №:** 78/н **от:** 18.05.1944

**Воинская часть:** 59 гв. ап 33 гв. сд 13 гв. ск 39 А
**Наименование награды:** Орден Александра Невского
**Приказ подразделения №:** 147 **от:** 05.03.1945

Воинская часть: 59 гв. ап 33 гв. сд 11 гв. ск 2 гв. А
Наименование награды: Орден Красного Знамени
Приказ подразделения №: 177/н от: 27.07.1945

Информация с наградных листов

к вх. 0475. 19.3.43

*Обязательно все графы заполнять полностью*

Вх/01662 25.3.43

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

Фамилия, имя и отчество КУХТО Александр Тарасович

Военное звание Гвардии майор

Должность, часть Начальник штаба 98 Гвардейского Артиллерийского полка

Представляется к ордену "КРАСНОГО ЗНАМЕНИ"

---

В

все графы заполнять полностью

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество Кухто Александр Тарасович

2. Звание Гвардии Подполковник 3. Должность, часть Командир 59 гвардейского артполка 33 гвардейской Стрелковой Севастопольской Дивизии.

Представляется к Ордену. Александра Невского.

---

Все графы заполнять полностью

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество КУХТО Александр Тарасович

2. Звание гвардии подполковник 3. Должность, часть Начальник штаба артиллерии 11 гвардейского краснознаменного стрелкового корпуса

Представляется к ордену ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ ПЕРВОЙ СТЕПЕНИ.

4. Год рождения 1910 5. Национальность Белорус 6. Партийность чл. ВКП/б/ с 1939г.

7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) В Отечественной войне с 23.6.41г. Южный, Закавказский и Северо-Кавказский фронты.

8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне Контужен 4.4.42г., контузия и ранение 17.5.42г. /находится в строю/

9. С какого времени в Красной Армии с 1934г. 10. Каким РВК призван Лепельским Военкоматом.

11. Чем ранее награжден (за какие отличия) Орд. Кр. Звезды пр.04/н 5.11.41г. Орд. Кр. Знамени пр.0130/н 17.6.43 9ар

I. Краткое, конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

Гв. подполковник КУХТО в должности Начальника штаба артиллерии корпуса с 15 марта 1943г. Штабную работу знает и всю энергию с желанием отдает работе своего штаба и подчиненных штабов.

Планирование артиллерийского наступления знает и умело контролирует его выполнение в процессе боя.

В предварительной операции по прорыву "Голубой линии" в районе Вышка, ЛЕНИНСКОЕ, ГОРНО-ВЕСЕЛЫЙ, с 7 по 12 августа и при прорыве этой линии 14 сентября 1943г., не считаясь с усталостью от бессонных ночей, сумел четко организовать разведку, обеспечить связью, как проволочной, так и радио, которая работала бесперебойно и путем четкого контроля за выполнением плана артиллерийского наступления и боевых распоряжений обеспечил выполнение плана полностью, что обеспечило прорыв "Голубой линии". В процессе боев за освобождение от гитлеровцев Кубани и Таманского полуострова тов. КУХТО руководил работой штаба артиллерии корпуса и подчиненных штабов также четко, самоотверженно и умело, что способствовало артиллерии выполнить поставленные задачи и обеспечить успешное продвижение стрелковых частей.

За проявленную личную самоотверженную работу, личную инициативу в штабной работе в борьбе с немецкими оккупантами на Кубани и Таманском полуострове-гвардии подполковник КУХТО достоин правительственной награды-ордена ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ ПЕРВОЙ СТЕПЕНИ.

КОМАНДУЮЩИЙ АРТИЛЛЕРИЕЙ
11 ГВАРДЕЙСКОГО КРАСНОЗНАМЕННОГО
СТРЕЛКОВОГО КОРПУСА
ГВАРДИИ ПОЛКОВНИК /АНТИПОВ/

11-е Гвардейск. стрелк. корпуса

"10" октября 1943г.

Командир (начальник) ____________
(звание)

"__" ____________ 194__ г.